Уладзімір КУЛІКОВІЧ,
кандыдат філалагічных навук

СУЧАСНАЯ ПРАВАПІСНАЯ СІТУАЦЫЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

НА МАТЭРЫЯЛЕ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЧНЫХ ВЫДАННЯЎ ДЛЯ ШКОЛЬНІКАЎ

УДК 811.161.3'354

Артыкул прысвечаны праблемам нармалізацыі і кадыфікацыі правапіснай сістэмы сучаснай беларускай мовы, павышэнню культуры маўлення ў беларускамоўных выданнях. На матэрыяле дзіцячых энцыклапедый, прысвечаных Ф. Скарыну, вызначаны традыцыйныя лексіка-граматычныя адступленні ад літаратурнай нормы і чатыры асноўныя графіка-арфаграфічныя тэндэнцыі, якія характарызуюць сучасную маўленчую практыку ў дачыненні да даведачнай літаратуры. Аўтар прыходзіць да высновы, што выяўленыя ў тэкстах рысы бытавой і архаічнай арфаграфіі прадвызначаюць некаторую дапрацоўку структуры і зместу сённяшніх правіл беларускай арфаграфіі.

Ключавыя словы: *арфаграфічная норма, варыянтнасць, бытавая арфаграфія, правіла, энцыклапедычныя выданні, кадыфікацыя.*

The article is devoted to the problems of normalization and codification of the spelling system of the modern Belarusian language, improvement of the culture of speech in Belarusian-language publications. Based on the material of children's encyclopedias dedicated to F. Skaryna, traditional lexical and grammatical deviations from the literary norm and four main graphic and orthographic trends that characterize modern speech practice in reference literature are established. The author comes to the conclusion that the features of everyday and archaic spelling revealed in the texts predetermine some refinement of the structure and content of the rules of Belarusian spelling that exist today.

Энцыклапедычныя выданні для школьнікаў – гэта адмысловая крыніца ведаў, запатрабаваны і складаны жанр выдавецкай прадукцыі, які спосабам падачы матэрыялу, яго структураваннем, наяўнасцю ілюстрацый, цікавых гісторый, займальных фактаў мусіць спрыяць развіццю комплекснага погляду на свет, абуджэнню цікавасці да ведаў і чытання, пашырэнню слоўнікавага запасу і ўзораў нарматыўнага напісання лексічных адзінак, сінтаксічных канструкцый. Яны – незаменная дадатковая крыніца навучання [4; 5; 10].

Даследаванне энцыклапедый для дзяцей з пункту гледжання захавання ў іх арфаграфічных стандартаў дазваляе акрэсліць шэраг актуальных праблем рэдакцыйна-выдавецкай падрыхтоўкі, наяўнасці / адсутнасці найноўшых фактаў, запатрабаваных грамадствам сёння, вывучэнню правапіснай сітуацыі ў краіне, паколькі менавіта ў энцыклапедыі акумулюецца разнастайная па паходжанні і сферы выкарыстання лексіка і фразеалогія. Словы і фразеалагізмы графічным абліччам дэманструюць стаўленне да нормаў, выканальнасць гэтых нормаў.

Задача артыкула – выявіць лексіка-граматычныя і графіка-арфаграфічныя адметнасці маўленчай практыкі і вызначыць тэндэнцыі сучаснай правапіснай сітуацыі ў Беларусі.

Матэрыялам для даследавання паслужыла энцыклапедыя "Францыск Скарына" ў трох частках вядомага даследчыка і кнігазнаўцы Алеся Сушы [11; 12; 13], дзе, на наш погляд, змястоўна, з улікам функцыянальнага прызначэння паказаны тры асноўныя тыпалагічныя рысы вобраза нашага нацыянальнага героя: універсальнасць, інтэлектуальнасць, вернасць ідэалагічным прынцыпам эпохі Адраджэння.

Чытацкі адрас кніг прадвызначыў іх структуру, змест, моўныя сродкі і спецыфіку візуалізацыі. У першай частцы "Францыск Скарына. Чалавек-энцыклапедыя", якая апавядае пра шматграннасць таленту нашага першадрукара, – каля 110 ілюстрацыйных фрагментаў, у другой ("Францыск Скарына. Чалавек свету", дзе расказваецца пра вандроўкі Скарыны па еўрапейскім кантыненце) – 139 ілюстрацый, у трэцяй ("Францыск Скарына. Чалавек-легенда", прысвечанай творчай спадчыне "найвялікшага працаўніка для роднага краю", узнікненню кнігадрукавання, тэхналогіям стварэння кніжнай прадукцыі таго часу) – каля 120 візуальных элементаў. Акрамя гэтага, у асноўным тэксце мноства ўнутрытэкставых тлумачэнняў складаных для разумення школьнікамі паняццяў, напрыклад: *жыў у адной з некалькіх* ***бурсаў*** *(інтэрнатаў)* [11, с. 18]; *ступень бакалаўра* ***арціум*** *(сямі вольных навук)* [11, с. 19]; *адзін з першых* ***русінаў*** *(так называлі сябе тагачасныя беларусы і ўкраінцы)* [11, с. 28]; *пад уладай мясцовых* ***дожаў*** *(князёў)* [12, с. 72]. Энцыклапедыя для школьнікаў вызначаецца нескладанасцю сінтаксічных канструкцый, іншымі асаблівасцямі, характэрнымі для мовы навукова-папулярных кніг.

Аналіз моўнага складніка навукова-папулярных выданняў дазволіў вызначыць шэраг заканамернасцей у пісьмовым пазіцыянаванні інфармацыі, выкарыстанні сродкаў беларускай сістэмы пісьма.

1. Наяўнасць лексічных і граматычных канструкцый, характэрных для размоўнага стылю, бытавога і архаічнага правапісу – напісанняў, якія не адпавядаюць сучасным правілам:

– плеаназмы: *Да асноўнага тэксту Псалтыра выдавец дадаў* ***сваю аўтарскую*** *прадмову* [13,

с. 39] (тут і далей вылучана намі. – *У. К.*); *У **сваіх працах** Скарына сцвярджае* [11, с. 6] (з пункту гледжання літаратурнай лексічнай нормы займеннікі лішнія);

– сказы з аднароднымі членамі, якія часта прапануюцца на разнастайных мовазнаўчых конкурсах у якасці матэрыялаў для выпраўлення памылак: *У сваіх працах Скарына сцвярджае права людзей **ганарыцца і любіць сваю айчыну*** [11, с. 6]; норма: *сцвярджае права людзей **ганарыцца сваёй айчынай і любіць яе***;

– варыянтныя канчаткі ў давальным склоне: *дзякуючы Францыску **Скарыне*** [11, с. 72], *удзячным Францыску **Скарыне*** [11, с. 114], *засведчыў асабістую апеку **Скарыне*** [12, с. 58], *прад'явілі іск Францыску **Скарыну*** [12, с. 57], ***Скарыну** былі вядомы* [12, с. 77], *помнік Францыску **Скарыну*** [13, с. 94]. Цікавая заканамернасць: у першай кнізе форма *Скарыне* ў давальным склоне ўжываецца 4 разы, форма *Скарыну* не выяўлена; у другой кнізе форма *Скарыне* – 6 разоў, *Скарыну* – 2; у трэцяй кнізе формы *Скарыне* няма, *Скарыну* сустракаецца 3 разы.

Сярод графіка-арфаграфічных элементаў выдання, якія акрэсліваюць сённяшнюю правапісную сітуацыю ў дачыненні да даведачнай літаратуры, можна адзначыць: 1) адсутнасць знака націску (акута); 2) варыянтнае напісанне ўласных і агульных найменняў; 3) адступленні ад правіл фанетызацыі ў напісанні асобных геаграфічных паняццяў і тэрмінаў; 4) тэндэнцыю да замацавання нацыянальна-культурнай адметнасці, запачаткаванай асобнымі правіламі арфаграфіі да фармантаў, якія не з'яўляюцца арфаграмамі.

1. Ва ўсіх частках энцыклапедыі няма ніводнага дыякрытычнага элемента для пазначэння націскных складоў. Функцыя ж такіх знакаў – агромністая! Яны папярэджваюць памылковае вымаўленне ўласных імён і незнаёмых для чытача слоў, забяспечваюць камфортнасць чытання: *віцэ-прыёр Тадэй Мусаці* [11, с. 22], *доктар Вэніус* [11, с. 33], *горад Задар* [12, с. 73], *Берталан Шэкелі* [12, с. 93], *Вітэнберг* [12, с. 106], *княгіняй Лібушай… Пржэмыслам* [12, с. 96], *ракі Прэгель* [12, с. 124], *Бертэль Торвальдсан, Крыстафер Вільгельм Экерсберг і Крыстэн Кёбке, фізік Ганс Крысціян Эрстэд* [12, с. 62], *Ханс Вайнрайх* [12, с. 120], *бурсаў* [11, с. 18], *Цэцінэ, Тыргавіштэ* [13, с. 35], *арціум* [11, с. 19], *металічныя жукавіны* [13, с. 88], *капіраваліся* і інш.

2. Варыянтныя напісанні слоў і словазлучэнняў зафіксаваны ў наступных выпадках:

– пры адлюстраванні "акання" на пісьме: *партрэта **Галілео** Галілея* [11, с. 24], ***Лютар**, **Лютара**, **Лютару**, **з Лютарам*** [12, с. 105–109] (ёсць і нарматыўныя: *партрэт **Галілеа** Галілея* [12, с. 85], ***Лютэр*** [11, с. 52; 12, с. 107], ***лютэранскі*** [12, с. 62, 120, 124], ***лютэранства*** [12, с. 122]);

– пры напісанні ***ў*** (з краткай), ***у*** (без краткі): *доктар **Фауст*** [11, с. 108], *такая **ўнія*** [11, с. 78], ***іудаізмам*** [11, с. 79], *пражывалі яўрэі (**іудзеі**)* [12, с. 15], *ва **Ўсходняй** Еўропе* [12, с. 43, 97, 122], *Блізкага **Ўсходу*** [12, с. 81], ***Матэўс** Мерыян* [12, с. 76], *герой **Ўільяма** Шэкспіра* [12, с. 108] (ёсць і нарматыўныя: *доктар **Фаўст*** [11, с. 108], ***Артэліуса*** [12, с. 89], *царкоўнай **уніі*** [11, с. 78]);

– пры напісанні (асобна і праз злучок) часткі *па* з назоўнікам *сутнасць*: *Дзейнасць Скарыны ў Празе і Вільні мела **па сутнасці** хрысціянскі асветніцкі характар* [11, с. 82]; ***Па сутнасці** дзяржава станавілася моцна цэнтралізаванай* [12, с. 112]; *выдавец дадаў сваю аўтарскую прадмову, якая, **па-сутнасці**, і адкрывае кнігу* [13, с. 39];

– пры выбары рэгістра (напісанне з вялікай і малой літары), а таксама пры выкарыстанні двукосся ў дачыненні да назваў біблейскіх выданняў Ф. Скарыны. Так, у перыфразе *Кніга кніг* рэкамендуецца перадаваць на пісьме першае слова з вялікай літары, а сам выраз пісаць без двукосся [9, с. 131].

У энцыклапедыі прапануюцца іншыя напісанні:

а) два словы з вялікай літары (*Кніга Кніг*), у тым ліку з граматычнай памылкай у форме меснага склону (*Кніге Кніг*): *працуючы над перакладам **Кнігі Кніг** (слова "Біблія" ў перакладзе з грэчаскай мовы азначае "кнігі")* [11, с. 56]; *"Прадмова" Францыска Скарыны да ўсёй Бібліі… – гэта нішто іншае як гімн **Кнізе Кніг** (Бібліі)* [11, с. 64]; *Ён меў намер не толькі самастойна перакласці вельмі складаныя для разумення тэксты **Кнігі Кніг** на родную мову* [11, с. 64]; *уся мудрасць ранейшых пакаленняў, на думку Скарыны, канцэнтравалася ў **Кніге Кніг** – Бібліі* [11, с. 86];

б) з малой літары ў двукоссі ("*кніга кніг*"): *Сярод рэлігійнай літаратуры важнейшае месца займала **"кніга кніг"** – Біблія* [13, с. 14]; *У Празе беларускі першадрукар распачаў выданне Бібліі – **"кнігі кніг"*** [13, с. 42].

Наш сучасны правапісны кодэкс не ўтрымлівае асобных нюансаў правапісу найменняў богаслужбовых выданняў. Іх напісанне адбываецца паводле складзенай традыцыі, прынятай у сінадальным рускім перакладзе. Так, прапануецца пісаць з вялікай літары і без двукосся:

– першае слова кніг Старога і Новага Запавету: *Кніга Руфі, Кніга Суддзяў ізраілевых, Трэцяя кніга Царстваў* і г. д. [9, с. 132];

– першае слова, акрамя родавых і службовых слоў, у назвах свяшчэнна-богаслужбовых і царкоўна-богаслужбовых кніг: *Актоіх, Апостал, Евангелле, Трэбнік малы* і г. д. Калі ж назва такой кнігі ўспрымаецца як літаратурны помнік, то аддаецца перавага яго напісанню ў двукоссі, першае

слова – з вялікай літары: "*Евангелле Іуды*", "*Евангелле дзяцінства Ісуса Хрыста*" [9, с. 134].

Гэтых прынцыпаў імкнуцца прытрымлівацца, праўда, не заўсёды паслядоўна, аўтары дзіцячай энцыклапедыі. Параўнаем:

– *Тытульны ліст* ***кнігі "Быццё"*** [11, с. 74]; *Гравюра з* ***Кнігі Быцця*** [13, с. 75];

– *патрыятычныя выказванні, адлюстраваныя ў прадмове да кнігі "Юдзіф"* [11, с. 116]; ***Кніга Юдзіф*** [13, с. 43], *Разварот* ***Кнігі Юдзіф*** [13, с. 45];

– *Ужо ў першым выданні Францыска Скарыны* ***"Псалтыр"*** *(1517) незразумелыя месцы ў царкоўнаславянскім тэксце былі патлумачаны* [11, с. 55]; *Ужо першыя словы самай першай кнігі Скарыны, якой быў* ***Псалтыр****, тлумачаць яго асветніцкія мэты* [11, с. 82]; *Першай такой датаванай кнігай з'яўляецца* ***Псалтыр*** [11, с. 82]; *Першай беларускай друкаванай кнігай стаў* ***Псалтыр*** [13, с. 38]; *уласна біблейскай кнігі* ***Псалтыр*** [13, с. 47];

– *Першая старонка рукапіснай копіі* ***"Апостала"*** *Францыска Скарыны* [13, с. 17]; *Важна звярнуць увагу на змест* ***"Апостала"*** [13, с. 52]; *Тут яны таксама пераклалі на славянскую мову асноўныя богаслужэбныя кнігі: Евангелле,* ***Апостал*** *і Псалтыр, якія адначасова з'яўляюцца кнігамі Біблii* [13, с. 30];

– *дзве літургічныя кнігі – "Актоіх" і* ***"Часаслоў"*** [13, с. 34]; *У той жа час Следаваны Псалтыр паводле зместу – гэта той жа просты Псалтыр, да якога дадаваліся* ***Часаслоў*** *(паслядоўнасць дзённых службаў)* [13, с. 47];

– *26 жніўня 1510 года тут быў надрукаваны "Актоіх", а 25 чэрвеня 1512 года –* ***"Евангелле"*** [13, с. 36]; *Новы Запавет Біблii змяшчае чатыры* ***Евангеллі****, кнігу Дзеяў апостальскіх, апостальскія пасланні і Адкрыццё Іаана Багаслова. Усе гэтыя кнігі, апрача* ***Евангелляў****, і былі выдадзены ў складзе "Апостала" Францыска Скарыны* [13, с. 52].

3. Выкарыстанне "бытавой" арфаграфіі, якая ігнаруе асобныя прадпісанні фанетычнага прынцыпу: ***выплочваць*** *падаткі ў Арду* [11, с. 111] замест нарматыўнага *выплачваць*; ***калонтытулаў*** замест рэкамендаванага *калантытулаў*: *Для загалоўкаў і калонтытулаў віленскіх выданняў Скарыны выкарыстаны малы прапісны шрыфт* [13, с. 66]. Паводле сучасных "Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі" (2008, § 23, п. 21) прыметнік, утвораны ад назвы венгерскага мястэчка Мохач, павінен мець форму *мохацкі*. У тэксце энцыклапедыі – ***Мохачская*** *бітва 1526 года* [12, с. 93].

4. У "Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі" ёсць пункт, які рэгламентуе напісанне фармантаў, што не з'яўляюцца арфаграмамі ў традыцыйным разуменні гэтага паняцця [8]. Таму, напэўна, правіла для іх мае рэкамендацыйны характар [6, с. 61–62]. Да адзначаных элементаў адносяцца суфіксы *-ір- / -ыр-*, якія выступаюць своеасаблівымі маркерамі тыпалагічных характарыстык слова; яны ўказваюць, што дзеясловы з такімі часткамі – гэта поўныя структурныя калькі, "штучныя, неўласцівыя нашай мове дэрываты" [1]. Дзеясловы, утвораныя без іх, з дапамогай запазычанага кораня і беларускага суфікса *-ава- / -ява-* – няпоўныя калькі (паўкалькі) [3, с. 181]; яны не адрозніваюцца лексічным значэннем ад тых, якія маюць суфіксальныя кампаненты *-ір- / -ыр-*, але затое робяць нашу мову "больш мілагучнай, спрыяюць захаванню нацыянальных моўных традыцый, павышаюць агульную культуру маўлення" [1].

У мове энцыклапедычных выданняў намі не выяўлены выпадкі паралельнага ўжывання дзвюх форм, г. зн. слоў з суфіксальнымі кампанентамі *-ір- / -ыр-* і са спрадвечна беларускімі суфіксамі *-ава- / -ява-*.

Аўтар, як правіла, аддае перавагу формам слоў (дзеясловы, назоўнікі, прыметнікі) з суфіксамі *-ава- / -ява-*: ***актывізавалася*** *здабыча карысных выкапняў* [12, с. 105]; ***арыентаваным*** *на захаванне* [11, с. 88]; ***арыентаваліся*** *на дасягненні* [13, с. 84]; ***арыентаваць*** *прававую сістэму* [11, с. 93]; *нягледзячы на* ***дамінаванне*** *нямецкіх каланістаў* [12, с. 124]; *каля 40 дакладна* ***датаваных*** *рукапісных кодэксаў* [13, с. 16]; ***ётаваныя*** *галосныя* [13, с. 67]; ***зафіксавана*** *на старонках* [13, с. 9]; ***збалансаваць*** *хрысціянскія погляды* [11, с. 88]; *вакол яго* ***згрупаваліся*** *іншыя нямецкія княствы* [12, с. 121]; ***ідэалізаваны*** *вобраз* [11, с. 110]; ***ілюмінаваныя*** *мініяцюры* [13, с. 16]; ***ілюмінаваны*** *ініцыял* [13, с. 82]; *для* ***інфармавання*** *насельніцтва* [1, с. 82]; ***ідэнтыфікаваць*** *месца і час вырабу паперы* [13, с. 58]; *не развівалася* ***ізалявана*** *ад іншых* [13, с. 13]; *справа Францыска Скарыны па перакладзе Біблii і яе* ***каментаванні*** *выглядае вельмі наватарскай* [13, с. 16]; ***пракаментаваць*** *складаныя для разумення эпізоды* [11, с. 76]; *майстэрскае* ***кампанаванне*** *тэксту,* ***канцэнтраванасць*** *стылявых прыёмаў* [11, с. 62]; ***ліквідаваў*** *апошнія адметнасці колішніх княстваў* [12, с. 105]; ***мадэрнізаваны*** *ваенны і гандлёвы флот,* ***цэнтралізавана*** *падатковая сістэма* [12, с. 62]; *вытворчасць паперы пачалі больш актыўна* ***механізаваць*** [13, с. 57]; ***мінімізавалі*** *ролю рэлігіі* [12, с. 82]; ***ратыфікавала*** *законы* [12, с. 72]; *для* ***рэфармавання*** *кірылічнага алфавіта* [13, с. 70]; ***рэфармавана*** *ўся дзяржаўная сістэма* [12, с. 120]; *добра* ***структураваныя*** *лекцыі* [11, с. 86]; ***трансфармаваны*** *ў парк французскага тыпу* [11, с. 38]; *тэхналогія друку на тканіне ў Кітаі* ***трансфармавалася*** *ў друк на паперы* [13, с. 19]; ***тыражаванне*** *кніг друкарскім спосабам* [11, с. 98]; ***цытаваў*** *яго ў сказанні* [13, с. 99]; *прынцып* ***штэмпелявання*** *быў вядомы* [13, с. 18]; *князь вымушаны быў* ***эміграваць*** [13, с. 35].

Адзінкавыя адступленні ад устаноўленай тэндэнцыі звязаны, на наш погляд, з чытацкім адрасам выданняў і жаданнем аўтара захаваць фармальна-семантычную выразнасць лексем. Тут найперш пакінуты: а) словы з фармантам *-ір-*, якія ў сучаснай маўленчай практыцы ўжываюцца паралельна з суфіксамі *-ява-* / *-ава-*: *акупіраваць, асацыіравацца, дубліраванне, капіравацца* (параўн.: *акупаваць, асацыявацца, асацыюецца, дубляванне, капіявацца*); б) адзінкі з вузка тэрміналагічным значэннем, у сучасных слоўніках, як правіла, формы з суфіксам *-ава-* не прапануюцца: *гравіравальны, дэкарыраванне, канкурыраваць, цэльнагравіраваны*; в) адзінкі, якія, на думку асобных даследчыкаў, пры замене суфіксаў *-ір-* на *-ава-* набываюць аманімічнае значэнне [2]: *сфарміравацца, фарміраванне, фарміраваць*: *Падуя была* ***акупіравана*** *французскімі войскамі* [12, с. 82]; *Скарына неадменна* ***асацыіруецца*** *сёння з беларускай літаратурай* [11, с. 64]; ***гравіравальныя*** *дошкі* [13, с. 49, 65, 76, 77]; ***дубліраванне*** *адных выяў* [13, с. 69]; *для* ***дэкарыравання*** *і абазначэння канца прадмоў і пасляслоўяў* [13, с. 68]; *Вакол горада вырасла цэлая сетка мястэчак, якія* ***канкурыравалі*** *паміж сабой* [12, 52]; ***капіраваліся*** *асобныя запісы* (13, с. 16); *вакол Полацка* ***сфарміравалася*** *самастойнае ўдзельнае княства* [12, с. 17]; ***фарміраванне*** *грамадства новага тыпу* [13, с. 64, 85]; ***фарміруюць*** *цэласны твор* [13, с. 81]; *У пачатку 10 стагоддзя* ***сфарміравалася*** *Чэшскае Княства (Багемія), якое стала адным з найбольш уплывовых дзяржаўных* ***фарміраванняў*** *у Цэнтральнай Еўропе* [12, с. 88]; ***цэльнагравіраваным*** *тэкстам* [13, с. 29].

Такім чынам, энцыклапедычныя выданні для школьнікаў А. Сушы – гэта не толькі якасная крыніца інфармацыі, эфектыўны сродак узаемадзеяння паміж дзецьмі і дарослымі, своеасаблівыя інвестыцыі ў інтэлектуальны і культурны патэнцыял беларускага грамадства. Сваім зместам яны дапамагаюць школьнікам развіваць кагнітыўныя навыкі, фарміраваць эмацыйнае ўспрыманне свету, успрымаць інфармацыйную культуру ва ўмовах лішку інфармацыі.

Графіка-арфаграфічная сістэма энцыклапедыі характарызуецца: 1) нешматлікімі дваістымі і дублетнымі напісаннямі слоў, графічны вобраз якіх змяніўся пасля 2008 г. (перадача акання, арфаграмы *ў, у*); 2) арфаграфіяй асобных слоў, якая супярэчыць вызначаным нормам (выкарыстанне дэфіса); 3) адступленнямі ад традыцыйных напісанняў (словы з *-ір-* / *-ыр*) на карысць кампактнасці словаформаў, мілагучнасці, прадвызначанай і правіламі, і лексікаграфічнымі працамі сучаснасці; 4) пошукамі шляхоў нармалізацыі для правапісу найменняў богаслужбовых выданняў мінулага, кніг, якія часта становяцца аб'ектам разгляду сучаснага чытача.

Прычынамі няўстойлівых напісанняў, на наш погляд, з'яўляюцца: 1) індывідуальныя аўтарскія і рэдактарскія звычкі вымаўлення і напісання асобных арфаграм; 2) дынамічныя працэсы сярод літаратурных і культурных традыцый, мэта якіх – пазбаўляцца ад графіка-арфаграфічных уплываў мінулага.

Спіс літаратуры

1. **Бабіч, Ю.** Дзеясловы з суфіксамі *-ірава-* (*-ырава-*) і *-ава-* (*-ява-*) у сучаснай беларускай мове / Ю. Бабіч // CatholicNews.by. – URL: https://catholicnews.by/dzejaslovy-z-sufiksami-irava-yrava-i-ava-java-u-suchasnaj-belaruskaj-move-pracjag/ (дата доступу: 15.01.2026).

2. **Бадзевіч, З. І.** Дзеясловы з суфіксальным кампанентам *-ір* /*-ыр* у сучаснай беларускай мове / З. І. Бадзевіч // Язык и социум : материалы VI Междунар. науч. конф. : в 2 ч.; 3–4 декабря 2004 г., Минск / редкол.: Л. М. Чумак (отв. ред.). – Минск : РИВШ, 2004 – Ч. 2. – С. 86–89.

3. **Кітаева, Т. В.** Дзеясловы з фармантам суфікса *-ір-* у аспекце дыялога культур / Т. В. Кітаева // Карповские научные чтения : сб. науч. ст. – Вып. 10 : в 2 ч. / редкол.: А. И. Головня (отв. ред.) [и др.]. – Минск : ИВЦ Минфина, 2016. – Ч. 1. – С.180–182.

4. **Колосова, Е. А.** Детские энциклопедии / Е. А. Колосова // Детство XXI века: социогуманитарный тезаурус : [тематический словарь-справочник] / отв. ред. С. Н. Майорова-Щеглова. – М. : Изд-во РОС, 2018. – С. 271–273. – URL: https://elibrary.ru/download/elibrary_36726370_65067269.pdf (дата обращения: 02.01.2026).

5. **Корочкина, А. В.** Детские энциклопедии: содержание и особенности методики подготовки / А. В. Корочкина, А. Р. Самигуллин // Вопросы энциклопедистики : ежегодный сборник статей / под общ. ред. У. Г. Саитова. – Уфа : Башкирская энциклопедия, 2013. – Вып. 3. – С. 102–110.

6. **Куліковіч, У. І.** Новае ў беларускай арфаграфіі. Правілы. Заданні, Тэсты. Даведачны матэрыял / У. І. Куліковіч ; пад рэд. М.Р. Прыгодзіча. – 3-е выд., стэрэатып. – Мінск : Новое знание, 2010. – 128 с.

7. **Куліковіч, У. І.** Сучасная выдавецкая практыка і беларуская літаратурная норма / У. І. Куліковіч // Корпоративные стратегические коммуникации: тренды в профессиональной деятельности : материалы междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 60-летию со дня рождения В. Р. Вашкевича, Минск, 5–6 окт., 2023 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: А. В. Беляев (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БГУ, 2023. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM). – ISBN 978-985-881-527-1. – С. 111–116.

8. **Куликович, В. И.** К вопросу о семантизации термина "орфография" в лингводидактическом дискурсе / В. И. Куликович // В. А. Богородицкий и современная лингвистика : труды и материалы Междунар. науч. конф. (Казань, 18–20 ноября 2024 г.) : в 2 т. / под общ. ред. Р. Р. Замалетдинова, Е. А. Горобец, Э. А. Исламовой. – Казань : Изд-во Казан. Ун-та, 2024. – Т. 1. – С. 97–101.

9. **Редакционно-издательское оформление церковных печатных изданий** : справочник автора и издателя. – М. : Изд-во Московской Патриархии Русской Православной Церкви, 2015. – 208 с.

10. **Пименова, Н. Н.** Обзор отечественных энциклопедических изданий по истории искусства для детей XX–XXI вв. / Н. Н. Пименова, М. И. Букова, А. В. Кистова // Журнал Сибирского федерального университета. Гуманитарные науки. – 2025. – Т. 18. – №. 4. – С. 703–712.

11. **Суша, А. А.** Францыск Скарына : у 3 ч. / А. А. Суша. – Мінск : БелЭн, 2016. – Ч. 1 : Чалавек-энцыклапедыя. – 120 с.

12. **Суша, А. А.** Францыск Скарына : у 3 ч. / А. А. Суша. – Мінск : БелЭн, 2016. – Ч. 2 : Чалавек свету. – 128 с.

13. **Суша, А. А.** Францыск Скарына : у 3 ч. / А. А. Суша. – Мінск : БелЭн, 2016. – Ч. 3 : Чалавек-легенда. – 112 с.